*1.* Балет : энцикл. / гл. ред. Ю. Н. Григорович. – М. : Сов. энцикл., 1981. – 623 с.
*2.* Большая энциклопедия Большого театра Беларуси = The Great Encyclopedia of the Bolshoi Theatre of Belarus / редкол.: В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл., 2014. – 692, [11] с.
*3. Чурко, Ю. М.* Белорусский балет в лицах / Ю. М. Чурко. – Минск : Беларусь, 1988. – 219 с.
*4. Чурко, Ю. М.* Белорусский балетный театр / Ю. М. Чурко. – Минск : Беларусь, 1983. – 183 с.

УДК 069

# МУЗЕЙНЫ САЙТ ЯК АСНОЎНЫ КАНАЛ КАМУНІКАЦЫІ Ў ЭПОХУ ПАНДЭМІІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ МУЗЕЯ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ)

***Д. А. Кашкур,*** *старшы навуковы супрацоўнік Навукова-даследчай і асветнай установы культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік», філіял – Музей беларускага кнігадрукавання, аспірант (саіскальнік) установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле сайт музея прааналізаваны як асноўны канал камунікацыі ва ўмовах пандэміі COVID-19. Менавіта пандэмія аказала значны ўплыў на развіццё віртуальных фарматаў камунікацыі, а таксама прымусіла музеі ў хуткім тэмпе перабудаваць сваю працу з наведавальнікамі. Пытанне разгледжана на прыкладзе сайта Музея беларускага кнігадрукавання, які стаў асноўным каналам камунікацыі ўстановы і яе аўдыторыі ў эпоху пандэміі. Апісаны розныя формы і віды музейнай анлайн-камунікацыі, прааналізавана праца музея ў віртуальнай прасторы, якая з'яўляецца адным з важнейшых інструментаў прэзентацыі і актуалізацыі культурнай спадчыны, што захоўваецца ў фондах музея. Падчас стварэння анлайн-кантэнту супрацоўнікі музея засвоілі новыя навыкі і развілі ўменні, якія спатрэбяцца і ў пасляпандэмійны час, бо віртуальная прастора з'яўляецца цалкам прыдатнай платформай для далейшай музейнай камунікацыі.

**Ключавыя словы:** пандэмія, COVID-19, музей, музейны сайт, музейная камунікацыя, канал камунікацыі, віртуальная прастора, Музей беларускага кнігадрукавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# MUSEUM WEBSITE AS THE MAIN CHANNEL OF COMMUNICATION IN THE ERA OF A PANDEMIC (ON THE EXAMPLE OF THE MUSEUM OF THE BELARUSIAN BOOK-PRINTING)

***D. Kashkur,*** *Senior Researcher of the Cultural Institution of scientific research and education «Polotsk National Historical and Cultural Museum-Reserve», branch – Museum of the Belarusian Book-Printing, post-graduate student (applicant) of the Educational Establishment «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article analyzes the museum's website as the main channel of communication in the context of the COVID-19 pandemic. The pandemic has asserted significant influence over development of virtual formats of communication and made museums revise their interaction with visitors. The subject is illustrated by the example of the Museum of the Belarusian Book-Printing website, which has become the main communication channel between the museum and its audience in the pandemic. The article describes different forms of museum communication using by the museum website. It explores the museum's activity in the virtual space as the main implement of presentation and actualization of the cultural heritage being maintained in museum collections. While creating online content the museum staff has built new skills which might be useful in post-pandemic times, because the virtual space is a fairly appropriate platform for the further museum communication.

**Keywords:** pandemic, COVID-19, museum, museum website, museum communication, communication channel, virtual space, Museum of the Belarusian Book-Printing.

2020 год стаў часам выпрабаванняў, выкліканых пандэміяй COVID-19. Кожная сфера так ці інакш сутыкнулася з яго наступствамі, уплыў апошніх адчуваецца не толькі сёння, але, як можна меркаваць, застанецца з намі і ў бліжэйшай будучыні. Вялікія страты падчас пандэміі панесла і сфера культуры, у т. л. музейныя ўстановы: знізілася колькасць наведвальнікаў, былі адменены ці перанесены шматлікія мерапрыемствы.

Музей беларускага кнігадрукавання не стаў выключэннем. У табліцы прыведзены даныя, узятыя з яго справаздач за 2019 і 2020 гг.

*Наведванне Музея беларускага кнігадрукавання ў 2019–2020 гг.*

| Від дзейнасці | Колькасць праведзеных мерапрыемстваў | |
|---|---|---|
| | 2019 г. | 2020 г. |
| Экскурсіі | 824 | 228 |
| Музейна-педагагічныя заняткі | 66 | 21 |
| Мерапрыемствы | 13 | 6 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, афлайн-камунікацыя паміж музеем і наведавальнікам была зведзена да мінімуму. Але ў эпоху інфармацыйнага грамадства дзякуючы развіццю інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій з’явіліся новыя магчымасці для камунікацыі паміж музеем і наведвальнікам. Безумоўна, прадстаўніцтва музеяў у Сетцы Інтэрнэт – з’ява не новая. Але менавіта пандэмія аказала значны ўплыў на развіццё віртуальных фарматаў музейнай камунікацыі, бо ігнараваць сучасныя ўмовы жыцця музеі, якія сутыкнуліся са стратай наведвальнікаў, не мелі магчымасці [2; 4]. Пры гэтым музеі былі вымушаны прыстасоўвацца да новай рэчаіснасці ў вельмі хуткім тэмпе і імкліва наладжваць працу ў анлайн-фармаце.

Анлайн-кантэнт, прапанаваны музеямі падчас пандэміі, можна падзяліць на кантэнт для індывідуальнага знаёмства і вывучэння музейных аб’ектаў і калекцый (анлайн-калекцыі, віртуальныя туры, віртуальныя рэканструкцыі і інш.), адукацыйна-асветніцкі кантэнт (анлайн-лекцыі і курсы, анлайн-экскурсіі, publik talk, падкасты і інш.) і культурныя мерапрыемствы анлайн [1]. Усе гэтыя разнавіднасці кантэнту былі падрыхтаваны супрацоўнікамі Музея беларускага кнігадрукавання і прадстаўлены на афіцыйным сайце book.polotsk.museum.by [3].

Кантэнт для індывідуальнага знаёмства і вывучэння музейных аб’ектаў і калекцый прадстаўлены на сайце музея ў выглядзе асобных старонак у пэўных раздзелах: у раздзеле «Пра музей» – старонкі «Знаёмства з музеем» і «3D-тур па музеі», у раздзеле «Экспазіцыя» – «Экспазіцыя музея» і «Віртуальная выставачная зала», у раздзеле «Калекцыі» – «Гісторыка-культурныя каштоўнасці ў экспазіцыі Музея беларускага кнігадрукавання», «Цікавыя экспанаты» і «Каталогі выданняў з фондаў музея-запаведніка».

Старонкі «Знаёмства з музеем» і «Экспазіцыя музея» адрасаваны ў першую чаргу наведвальнікам, якія не былі раней у музеі ці амаль не ведаюць яго. У гэтай віртуальнай прасторы можна пазнаёміцца з прынцыпам і логікай пабудовы пастаяннай экспазіцыі, а інфармацыя пра музей тут пададзена ў найпрасцейшай форме: у выглядзе тэксту і малюнкаў. У такім жа выглядзе прадстаўлена інфармацыя на старонцы «Гісторыка-культурныя каштоўнасці ў экспазіцыі Музея беларускага кнігадрукавання». Па прызначэнні падобны да гэтых старонак і «3D-тур па музеі», але ён больш грунтоўны, і знаёмства з экспазіцыяй з яго дапамогай займае больш часу, інфармацыя тут падазена ў даволі цікавым фармаце: праз спецыяльную платформу Roundme, якая ўяўляе сабой набор панарамных малюнкаў, злучаных праз парталы і запоўненых мультымедыйным кантэнтам. Такім чынам, на старонцы «3D-тур па музеі» магчыма агледзець экспазіцыю на 360 градусаў. Падобныя старонкі існавалі на сайце і раней, але менавіта падчас каранавірусу яны былі абноўлены і сістэматызаваны.

Да пандэміі супрацоўнікі музея таксама стваралі віртуальныя выстаўкі, але менавіта з 2020 г. яны сталі больш тэхнічна дасканалымі і раз-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

настайнымі. Так, апошні праект, які размешчаны ў «Віртуальнай выставачнай зале» ў пачатку 2021 г., прысвечаны 100-годдзю І. Шамякіна. Ён змясціў «ажыўшую выяву» пісьменніка, а музейныя прадметы на гэтай выстаўцы прадстаўлены праз анлайн-сервіс для стварэння інтэрактыўнага кантэнту Testix. Праз Testix прадстаўлена на сайце і старонка «Цікавыя экспанаты». Фармат Testix накіраваны на тое, каб наведвальнік заставаўся на сайце даўжэй, і прапаноўвае гартанне ілюстрацый накшталт Instagram-публікацыі.

Асобнае месца на сайце музея займае старонка «Каталогі выданняў з фондаў музея-запаведніка». Яе стварэнне накіравана не толькі на прэзентацыю музейных фондаў, але і на актывізацыю прафесійнага навуковага супрацоўніцтва. Згодна даным Google Analytics, гэта старонка не самая папулярная сярод наведавальнікаў сайта: на яе пераходзіць амаль у 6 разоў менш наведвальнікаў, чым на старонку «Цікавыя экспанаты», што тлумачыцца яе вузкай скіраванасцю і спецыфічным прызначэннем.

Адукацыйна-асветніцкі кантэнт прадстаўлены ў раздзеле «Музейны хаб», дзе размясціліся старонкі з гульнямі, тэстамі, віктарынамі. Да пандэміі гэтага раздзела на сайце не існавала. Менавіта ў ім пачалася камунікацыя з наведавальнікамі ў форме гульні. Сярод матэрылаў гэтага раздзела: гульня ў стылі dot-to-dot («ад кропкі да кропкі»); аўдыягульня, якая вялася праз сацсеткі і ў выніку якой пераможца атрымліваў падарунак ад музея; тэсты па гісторыі рукапіснай і друкаванай кнігі і звязаных з імі асоб і інш. Усе гэтыя гульні не толькі дазваляюць людзям цікава правесці час у дамашнім атачэнні, але і могуць быць выкарыстаны педагогамі.

Культурныя мерапрыемствы Музея беларускага кнігадрукавання падчас пандэміі таксама пачалі праводзіцца пераважна ў анлайн-фармаце. Сярод іх Дзень музеяў-2020 і 30-годдзе музея.

У раздзеле «Музейны хаб» быў рамешчаны праект «НЕфарматнае інтэрв’ю: папулярныя пытанні музейшчыку», што для музея стала першым анлайн-мерапрыемствам такога тыпу. Першая частка праекта была прымеркавана да традыцыйнага музейнага свята – Дня музеяў. Відэаролік быў пабудаваны ў фармаце інтэрв’ю з супрацоўнікам музея, які распавёў пра сваю прафесію і пра тое, чым займаецца кожны дзень, акрамя экскурсій. Падобны фармат стаў папулярным у інтэрнэце ў апошнія гады, а пачаўся ён з аўтарскага праекта «10 глупых вопросов» YouTube-канала «Жиза», у якім прадстаўнікі розных прафесій адкрыта і зразумела распавядаюць пра сваю працу, а таксама дзеляцца карыснымі парадамі. Да Дня музеяў было размешчана інтэрв’ю са старшым навуковым супрацоўнікам музея, а ў верасні, адразу пасля 30-годдзя ўстановы, з’явілася поўная версія «НЕфарматнага інтэрв’ю», у якую ўвайшлі таксама расповеды загадчыка музея і наглядчыка. Такі фармат спадабаўся аўдыторыі, аб чым сведчаць каментарыі: «Класс!! Выпускайте чаще этот формат с людьми, а не экспонатами или старыми фото и видеорядами ))) живые люди, их речь, мысли,  эмоции в контексте функционирования музея-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заповедника намного интереснее, чем обработанные видео под музыку со старыми фото рядами… живая настоящая жизнь музея намного интереснее и увлекательнее статичной истории экспонатов».

Да свайго 30-годдзя музей прымеркаваў яшчэ адну падзею ў віртуальным фармаце – круглы стол «Камунікатыўныя практыкі актуалізацыі помнікаў кніжнай культуры». У дзень яго правядзення на сайце музея былі прадстаўлены даклады і прэзентацыі ўдзельнікаў, а навуковыя артыкулы былі апублікаваны на сайце Полацкага музея-запаведніка.

Такім чынам, падчас пандэміі музеі за абмежаваны час здолелі перабудаваць сваю працу і перанесці яе ў віртуальную прастору, каб працягнуць выконваць сваю асноўную функцыю – прэзентаваць і актуалізаваць культурныя каштоўнасці. Больш за тое, ва ўмовах вымушанай працы па стварэнні анлайн-кантэнту супрацоўнікі музеяў засвоілі новыя навыкі і развілі ўменні, якія спатрэбяцца і ў пасляпандэмійны час. Цяпер дакладна зразумела, што віртуальная прастора, нягледзячы на ўсе рызыкі, не дадатковая, а цалкам самастойная платформа, прыдатная для якаснай музейнай камунікацыі, якая вызначаецца зручнасцю, мабільнасцю, таннасцю, інтэрактыўнасцю, дынамічнасцю і прывабнасцю для маладой аўдыторыі.


*1. Ванюшкина, Л. М.* Музей на пересечении реального и виртуального миров [Электронный ресурс] / Л. М. Ванюшкина, С. А. Тихомиров // Cyberleninka. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/muzey-na-peresechenii-realnogo-i-virtualnogo-mirov/viewer. – Дата доступа: 03.09.2021.

*2. Ведерникова, Н.* Как выживали музеи во время пандемии 2020 года: переход в онлайн, флешмобы и онлайн-выставки / Н. Ведерникова // Музей. – 2021. – № 1. – С. 14–21.

*3.* Музей беларускага кнігадрукавання [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: book.polotsk.museum.by. – Дата доступу: 03.09.2021.

*4. Саркисова, Е. Г.* Музейное пространство в реальном и виртуальном коммуникативных полях: грани восприятия [Электронный ресурс] / Е. Г. Саркисова // Cyberleninka. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/muzeynoe-prostranstvo-v-realnom-i-virtualnom-kommunikativnyh-polyah-grani-vospriyatiya/viewer. – Дата доступа: 02.09.2021.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ